ПЛАЧ
НЕ ТОЛЬКІ
АБ НОТР-ДАМЕ... 9

АДЗІНЫ Ў КРАІНЕ
ПРАВАСЛАЎНЫ
ЭКЗАРЦЫСТ –
У СМІЛАВІЧАХ 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

23 КРАСАВІКА 2019 г. АЎТОРАК № 76 (28943)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:

«Адзін з галоўных напрамкаў работы міністэрства — гэта ўзровень заработнай платы, дастойныя рабочыя месцы. Другі напрамак — людзі сталага ўзросту: узровень іх жыцця. Міністэрствам падрыхтаваны канкрэтныя прапановы аб павышэнні пенсій з 1 мая гэтага года. У сярэднім наша прапанова — павышэнне на Br25. Гэта крыху больш за 6 %. Я кажу пра пенсіі па ўзросце. Што датычыцца магчымасці яшчэ аднаго павышэння пенсій на працягу года, то ўсё залежыць ад росту заработнай платы. Калі гэта мэтавы сцэнарый развіцця, то, вядома, мы зробім яшчэ адзін крок».

КАРАТКА

• **Тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным адбылася 22 красавіка па ініцыятыве расійскага боку. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі бягучыя моманты двухбаковых адносін, перспектывы развіцця супрацоўніцтва.**

• Маштабныя вучэнні МНС пройдуць у Стаўбцоўскім раёне 24—26 красавіка.

• **Святкаванне Бялыніцкай іконы Божай Маці перанеслі на 1 мая.**

• У Гомельскай вобласці ўвялі ў абарот больш за 16 тыс. га зямель, забруджаных пасля аварыі на ЧАЭС.

• **Няякасная расійская нафта прывяла да выхаду са строю дарагога абсталявання на Мазырскім НПЗ.**

• Дэпазіты на сямейны капітал у Беларусі адкрыты больш чым на $660 млн.

ISSN 1990 - 763X

ДАВЕСЦІ ДА ЛАДУ СВАЮ КРАІНУ

Аляксандр Лукашэнка падчас рэспубліканскага суботніка працаваў на тэрыторыі гісторыка-культурнага комплексу «Лінія Сталіна»

Спачатку кіраўніку дзяржавы расказалі пра комплекс, правялі невялікую экскурсію, пасля чаго ён пачаў саджаць дрэвы. У мэтах увекавечання памяці 75 салдат, загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны, парэшткі якіх былі знойдзены пры будаўніцтве комплексу, і ў гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў было пасаджана 75 дубоў. Акрамя таго, было пасаджана 30 соснаў — у сувязі з 30-годдзем выводу кантынгенту савецкіх войскаў з Афганістана. Пасля гэтага беларускі лідар пагутарыў з журналістамі.

Фота БелТА.

Не «пакутуйце» пра наш суверэнітэт...

Падчас Паслання кіраўнік дзяржавы асаблівую ўвагу аддаў суверэнітэту. У прыватнасці, ён адзначыў, што той, хто сёння асмеліцца зняшчыць Беларусь — Прэзідэнт, урад ці яшчэ хтосьці, — будзе праклятый беларускім народам. Той жа, хто адважыцца зрабіць гэта сілай, атрымае наймагутнейшы адказ, сказаў беларускі лідар. Гэтыя выказванні ў шматлікіх палітыкаў выклікалі рэзкую рэакцыю, у тым ліку з Расіі. «Чаму гэта адбылося, як бы вы гэта пракаментавалі?» — спыталі ў Аляксандра Лукашэнкі.

СТАР. 2

ТУТ НАРАДЖАЮЦЦА ЛЕСІКІ

У швачак клецкага прадпрыемства «Фірма Мальвіна» цяпер надзвычай цікавая праца: яны вырабляюць тысячы выяў лісяняці Лесіка — сімвала маючых адбыцца II Еўрапейскіх гульняў. З-пад умелых рук майстрых (адна з іх — швачка Юлія КАРОЛЬ, на здымку) гарэзлівае лісяня паўстае ў выглядзе мяккіх цацак, заплечнікаў, бірулек, каб раз'ехацца пасля разам з гасцямі Гульняў без перабольшання па ўсім свеце.

Фота БелТА.

Па сезоне

Атракцыёны рыхтуюцца да лета

Што робіцца, каб каруселі былі бяспечныя

Сярэдзіна красавіка — час, калі сталічныя паркі рыхтуюцца да масавага наведвання. Ужо на наступным тыдні маленькіх і дарослых мінчан і гасцей сталіцы пачнуць катаць атракцыёны. Але перад тым, як каруселі будуць адкрытыя для ўсіх ахвотных, гэтыя механічныя забаўкі трэба праверыць належным чынам. У гэтыя дні людзі, якія гуляюць па парках, могуць бачыць, як тэсціруюцца атракцыёны — на сядзенні пагружаны мяшкі з пяском, а самі агрэгаты здзяйсняюць тэставыя прагоны.

— Парк атракцыёнаў у сталіцы, які мы мусім праверыць, складае 59 машын, — гаворыць **выконваючы абавязкі Мінскага гарадскога ўпраўлення Дзяржпрамнагляда МНС Генадзь РУМКІН.**

СТАР. 4

Цягнік зараз на вышыні 14,5 метра ад зямлі.

ДАВЕСЦІ ДА ЛАДУ СВАЮ КРАІНУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У гэтага пытання ёсць два аспекты — унутраны і знешні, як растлумачыў Прэзідэнт. «Унутраны звязаны з тым, што Лукашэнка, яшчэ нехта хочуць Беларусь уключыць у склад якой-небудзь дзяржавы... Таму калі Лукашэнка гэта зробіць, ён будзе праклятый народам. Гэта датычылася ўнутранай часткі, унутранага боку пытання, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Што датычыцца знешняй: гісторыя ж ведае, колькі было такіх выпадкаў, калі сілы той ці іншай дзяржавы інкарпаравалі, уключалі ў склад іншай дзяржавы, упарадкоўвалі і гэтак далей. Таму гэта быў і знешні акцэнт, што, калі хтосьці пасмее, — атрымае адпор».

Беларускі лідар падкрэсліў: дарма «пакутуюць» некаторыя палітыкі, асабліва ў Расіі, з нагоды яго слоў.

«Ах, гэта вось супраць Расіі». Ведаеце, гэтыя фразы былі накіраваныя супраць усіх, хто паспрабуе гэта зрабіць. Гэта па-першае, — сказаў ён. — Па-другое, наколькі я разумею цяпер, я гэта вам шчыра кажу, Расія — гэта, можна сказаць, аплот і нашага суверэнітэту. Не дай бог што здарыцца — я да гэтага часу лічу, што мы з Расіяй будзем у акопах разам».

Каго б ні абралі — знойдзем агульную мову

Напярэдадні другога тура прэзідэнцкіх выбараў ва Украіне журналіст пацікавіўся, як Аляксандр Лукашэнка ацэньвае апошнія падзеі па гэтай тэме — у тым ліку дэбаты кандыдатаў Парашэнкі і Зяленскага на стадыёне «Алімпійскі», а таксама як вынікі паўплываюць на беларуска-ўкраінскія адносіны.

«Абсалютна перакананы, каго б украінскі народ ні абраў Прэзідэнтам, у нас застануцца самыя добрыя і самыя цёплыя адносіны з гэтай краінай, — падкрэсліў беларускі лідар. — Валодзя Зяленскі — чалавек новы, якога можна навучыць, — я заўважыў гэта ўчора па яго выступленні. Так, малады, так, яшчэ нявопытны. Але слухайце, я таксама калісьці быў яшчэ больш малады і нявопытны. Таму ці мне сёння ацэньваць Зяленскага?»

Ён зноў падкрэсліў: калі Украіна абярэ Прэзідэнтам Уладзіміра Зяленскага, Беларусь выбудуе такія ж добрыя адносіны. Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу, што ўсё залежыць ад народа, а не кіраўніка.

Беларускі лідар таксама сфармуляваў вынік дыялогу на стадыёне «Алімпійскі»:

«Ніхто ніякіх пераваг там не атрымаў. Ніхто. [...] Я думаю, што Пётр Парашэнка нічога не страціў, а Валодзя Зяленскі нічога дадаткова не атрымаў. Яны засталіся пры сваіх».

Пры гэтым, дадаў кіраўнік дзяржавы, гэтыя дэбаты прымусілі народ сур'ёзна падумаць і асэнсаваць каштоўнасць і важнасць нядзельнага галасавання.

Пра Курапаты: паважаць тых, хто там ляжыць

У апошні час у некаторых СМІ зноў стала падымацца тэма Курапатаў. У Прэзідэнта пацікавіліся, ці магчымы кансэнсус наконт таго, што і як павінна быць ва ўрочышчы.

Ён адзначыў, што тэма Курапатаў і адпаведнага градуса ў грамадстве некалькі перабольшваецца.

«Людзі сёння займаюцца на заводах, фабрыках, сеюць хлеб, разумеючы, што без гэтага нельга. Яны нават не ведаюць пра нашы хітраспляценні, нейкія дэбаты, нейкія градусы... А тыя, хто гэта чуе, задаюцца пытаннем: што, больш няма чаго рабіць? Іншыя пытаюцца, якія больш у тэме: што, зноў? Бо на Курапатах выраслі многія апазіцыйныя нашы палітыкі, вы гэта выдатна ведаеце. І мне здавалася, што тэма Курапатаў стала той тэмай, якая павінна быць у грамадстве. Я ўжо думаў, што ніхто больш не будзе гэтую праблему палітызаваць і ніхто не будзе нажывацца на гэтай тэме як палітык. Але не», — сказаў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што з яго патрабавалі, яго пастаянна папракалі: чаму там няма парадку. «І на «Вялікай размове» я сказаў: добра, калі ўжо на тое пайшло, трэба Прэзідэнту і тут парадак навесці, я паспрабую, я гэта зраблю. Не я, людзі, якім было даручана, яны з душой шчыра прыйшлі, вычысцілі гэтую тэрыторыю, абгарадзілі лёгкай агароджай», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым беларускі лідар звярнуў увагу, што акультурванне яшчэ не скончана: на агароджу павесяць кветкі, як на сталічным праспекце Пераможцаў.

Акрамя таго, зробяць вароты, каб людзі маглі прыйсці, — і гэта, па словах Прэзідэнта, будуць простыя брамка і вароты. Чаму было прынята рашэнне ўстанавіць агароджу?

Даходзіла да таго, што там некаторыя спраўлялі свае фізіялагічныя патрэбы. «Людзі выгульвалі сабак па гэтых магілах, па галовах людзей, якія там ляжаць, якім не трэба гэтая палітыка», — заўважыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы пракаментаваў і крыжы, якія паставілі па перыметры ўрочышча:

«Але калі б гэта крыжы былі ад душы, калі б гэта людзі прыйшлі не за грошы... Яны выставілі крыжы на агляд па сем, па восем метраў вышынёй. Гэта ад душы? Не. Я спрабаваў зрабіць ад душы. І гэта яшчэ не заканчэнне — мы добраўпарадкуем гэта ўрочышча», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: кожны год, палітызуючы праблему, мы топчамся па галовах мёртвых і варушым іх прах. «Гэта што, нармальна? Гэта не нармальна. Гэта мой пункт гледжання — можа быць, у кагосьці іншы. Нейкі іншы Прэзідэнт прыйдзе і пачне шукаць нейкі кансэнсус і зноў перакапае гэтыя магілы. Пакуль я Прэзідэнт, гэтага не будзе. Будзе вызначаны парадак, будуць пэўныя правілы, нікому не забаронена будзе туды прыйсці — але па гэтых правілах — і аддаць даніну павагі тым, хто быў застрэлены ў 30-я, 40-я гады, яшчэ ў нейкія гады», — дадаў беларускі лідар.

Ён расказаў, што, калі канчаткова ўпарадкуюць урочышча, на гэтую тэму яшчэ пагавораць.

З мінулага трэба браць найлепшае

Паводле слоў Прэзідэнта, цяпер засталося няшмат людзей, якія лічаць суботнікі перажыткам мінулага. Раней было больш складана — тады кіраўнік дзяржавы спрабаваў захаваць добрую савецкую традыцыю ў Беларусі.

«Мне прыйшлося фактычна насаджваць, угаворваць. Добра, што ў нас былі людзі старэйшага пакалення, якія хадзілі на суботнікі, якія шануюць гэтыя суботнікі дагэтуль і тады шанавалі. Яны мне здорава дапамаглі. Яны пайшлі следам за мной, а за намі пацягнулася наша моладзь. Яна спагадная, яна добрая. І ведаеце, гэта ў рэчышчы той палітыкі, якую я заўсёды прапаведаваў: нельга нічога перакрэсліваць са сваёй гісторыі, бо гэта ў нас было. І з таго мінулага трэба ўзяць усё найлепшае. Я лічыў, што суботнік — гэта тое найлепшае, што мы павінны з мінулага прынесці ў сучаснасць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Столькі ж — і нават больш — у гады развалу СССР было праціўнікаў такіх месцаў, як «Лінія Сталіна», сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Я не імя Сталіна адраджаў, хоць і ён гэтага заслугоўвае. Я адраджаў гэты аб'ект, які сведчыць пра тую частку гісторыі, якая была ў нас і якую, на жаль, на той час, асабліва моладзь, ды і мы, і я таксама як гісторык няправільна разумеў. Няправільна — не тое што недакладна, няправільна разумеў», — заявіў беларускі лідар.

Прэзідэнт таксама падкрэсліў: падзеі, якія адбываліся на «Лініі Сталіна» падчас вайны, павінны стаць урокам для нас — і гэты ўрок падштурхоўвае Беларусь да таго, каб парах трымаць сухім, каб краіна была гатовая адказаць на агрэсію з любога боку. Пры гэтым важна разумець, што ў Беларусі няма такога рэсурсу, каб весці зацяжныя войны. «Так, Расія можа дапамагчы. Але раптам там будзе кіраўніцтва іншае і не дапамогуць — што тады? Таму трэба разлічваць на сябе. А калі брат дапаможа, падставіць плячо, то тады хутчэй разбяромся з агрэсарам», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
«Лінія Сталіна», Мінскі раён.

Абмяркоўваем Пасланне Прэзідэнта

Старшыня Магілёўскага райвыканкама Анатоль ДУЦЬКО:

— Гэтага Паслання ўсе чакалі, я, напрыклад, яго двойчы праслухаў. Правільна ўсё было сказана. У прыватнасці, калі размова ішла пра сельскую гаспадарку, вельмі справядліва было ўказана на нядобрасумленных фермераў, якія зямлю бяруць, а вытворчасцю не займаюцца. І сярод іх, на жаль, не заўсёды ёсць гаспадары. Раней само слова «фермер» было сінонімам якасці, але ж гэта не заўсёды адпавядала рэчаіснасці. На планёрцы ў райвыканкаме мы прамову Прэзідэнта абмеркавалі, зверылі з ёй свой алгарытм дзеяння. Відаць, што Прэзідэнт, перад тым як выйсці на трыбуну, усё ўважліва абдумаў і ўзважыў. Вельмі дакладна пастаўлены задачы, прычым па любым кірунку. Іх проста неабходна выконваць, не трэба нічога выдумляць. Сёння ўсюды павінен быць добры гаспадар — і на прадпрыемстве, і на зямлі. Усё залежыць ад кіраўніка. Якія б фінансавыя патокі ні ўліваліся ў вытворчасць або сельскую гаспадарку, калі няма кіраўніка, нічога не атрымаецца. Падобныя выступленні я заўсёды выразаю з газеты і падшываю, каб час ад часу звяраць па іх свае дзеянні.

Падрыхтавала Нэлі ЗІГУЛЯ.

Блізкая ўлада

ВЫЯЗНЫЯ ПРЫЁМЫ ПРАЦЯГВАЮЦЦА

Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае на планавай аснове праводзіць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах. Чарговыя сустрэчы запланаваныя на 23—26 красавіка, паведамляе БелТА.

Так, **23 красавіка памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Віталь ВОЎК у 10.00** пачне прыём у Дубровенскім райвыканкаме. Таксама **ў 10.00** прыём грамадзян **у Любанскім райвыканкаме** пачне **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ.**

24 красавіка з 9.00 у Мінскім гарвыканкаме грамадзян будзе прымаць **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінску Віталь ПРЫМА. У 11.00 начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ** сустрэнецца з грамадзянамі ў Рагачоўскім райвыканкаме. **У 14.00 начальнік галоўнага эканамічнага ўпраўлення Дзмітрый БАРАБАНАЎ** пачне прыём **у адміністрацыі Заводскага раёна Мінска.**

25 красавіка начальнік галоўнага дзяржаўна-прававога ўпраўлення Андрэй МАЦЕЛЬСКІ з 10.00 будзе прымаць грамадзян **у адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Мінска.**

26 красавіка з 15.00 у Карэліцкім райвыканкаме будзе працаваць **Ігар СЯКРЭТА, начальнік упраўлення знешняй палітыкі.**

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Уладзімір Зяленскі пераканаўча перамог на выбарах Прэзідэнта Украіны

У мінулую нядзелю ва Украіне прайшоў другі тур прэзідэнцкіх выбараў. Прадстаўнік партыі «Слуга народа» Уладзімір Зяленскі значна апярэдзіў свайго канкурэнта, дзеючага кіраўніка дзяржавы Пятра Парашэнку — 73,2 працэнта супраць 24,4 працэнта галасоў. Зяленскага падтрымалі 13,4 мільёна выбаршчыкаў, Парашэнку — больш за 4,4 млн. Вынікі выбараў павінны быць устаноўлены Цэнтрвыбаркамам не пазней за 1 мая на падставе арыгіналаў папяровых пратаколаў акруговых выбарчых камісій. Парашэнка павіншаваў саперніка з перамогай. Але, выступаючы перад прыхільнікамі, ён заявіў, што не пакіне палітыку. Інаўгурацыя абранага Прэзідэнта павінна адбыцца не пазней за 31 мая. Зяленскі афіцыйна прыступіць да выканання сваіх абавязкаў, калі на ўрачыстым пасяджэнні Вярхоўнай Рады прынясе прысягу ўкраінскаму народу.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Уладзіміра Зяленскага з абраннем на пасаду Прэзідэнта Украіны. «З задавальненнем адзначаю, што падмуркам адносін паміж нашымі краінамі традыцыйна з'яўляюцца загартаваныя сумеснай гісторыяй брацкія сувязі беларусаў і ўкраінцаў. Пацвярджаю, Беларусь заўсёды была і застанецца для Украіны прадказальным партнёрам, надзейным суседам і добрым сябрам», — адзначаецца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы выказаў перакананне, што сумесныя намаганні дазволяць захаваць на доўгі час і паглыбіць пазітыўную дынаміку двухбаковага супрацоўніцтва, а дзейнасць Уладзіміра Зяленскага ў якасці кіраўніка дзяржавы будзе садзейнічаць росквіту Украіны, усталяванню міру і грамадзянскай згоды.

На Шры-Ланцы падчас серыі тэрактаў загінулі сотні людзей

На Шры-Ланцы з раніцы 21 красавіка ўсяго за некалькі гадзін адбылося восем выбухаў, тры з іх — у пяцізоркавых гатэлях, яшчэ тры — у каталіцкіх храмах. Хваля тэрактаў была прымеркавана да святкавання Вялікадня. Першыя шэсць выбухаў адбыліся амаль адначасова. Гэтыя напады сталі самымі крывавымі за апошнія дзесяць гадоў — з моманту заканчэння грамадзянскай вайны. Як паведаміла агенцтва AFP, за дзесяць дзён да тэракта кіраўнік паліцыі Шры-Ланкі папярэдзіў сваіх падначаленых, што баевікі-смяротнікі ісламісцкага руху NTJ могуць планаваць напады на цэрквы. Улады Шры-Ланкі абвясцілі 23 красавіка днём жалобы па загінулых. Таксама з аўторка ў краіне ўводзіцца рэжым надзвычайнага становішча, а ў сталіцы Каломба з 20.00 да 4.00 будзе дзейнічаць каменданцкая гадзіна. Акрамя таго, улады вырашылі часова закрыць доступ да ўсіх буйных сацсетак і інтэрнэт-месенджараў. СМІ паведамляюць, што адказнасць за напады ўзяла на сябе мясцовая джыхадысцкая групоўка, аднак ва ўрадзе лічаць, што кіраванне дзеяннямі джыхадыстаў ажыццяўляла міжнароднае ісламісцкае фарміраванне.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Дэмакратычнай Сацыялістычнай Рэспублікі Шры-Ланка Майтрыпалу Сірысену ў сувязі з гібеллю людзей у выніку тэрактаў. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі з вялікім болем успрынялі навіны пра шматлікія чалавечыя ахвяры ў выніку серыі вераломных тэрарыстычных актаў, якія адбыліся на Шры-Ланцы.

ПРАЦАВАЛІ ДРУЖНА І ЗЛАДЖАНА

Падчас традыцыйнага суботніка, што ладзіцца ўвесну, значна прыгажэюць нашы гарады і вёскі: мясцовыя жыхары разам з тымі, хто нарадзіўся тут і з'яднаны непарыўнай сувяззю с роднымі мясцінамі, прыбіраюць тэрыторыі, высаджваюць новыя алеі, рамантуюць і аднаўляюць знакавыя помнікі... Сёлетні працоўны дэсант таксама шчыраваў па ўсёй краіне: падрабязнасці з рэгіёнаў падрыхтавалі ўласныя карэспандэнты «Звязды».

ВІЦЕБШЧЫНА

У Віцебскай вобласці на аб'ектах суботніка працавала каля 355 тысяч чалавек. Далучыліся да агульнай справы і вышэйшыя дзяржаўныя асобы.

У прыватнасці, **спікер ніжняй палаты беларускага парламента Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** працаваў у віцебскім парку Тысячагоддзя. У Полацкім раёне **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА** высаджвала дрэвы на тэрыторыі Кургана Бессмяротнасці. Там была закладзена ліпавая алея ў гонар 75-й гадавіны вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У Гарадоцкім раёне **кіраўнік МНС Уладзімір ВАШЧАНКА** разам з калегамі высадзіў бярозавую алею.

У ліку знакавых аб'ектаў, дзе наводзілі прыгажосць, была і тэрыторыя сядзібы сусветна вядомага мастака Ілы Рэпіна.

Удзельнікі суботніка ў Віцебскай вобласці зарабілі каля 860 тысяч рублёў.

МІНШЧЫНА

Старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ, старшыня абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Пётр ВАБІШЧЭВІЧ пасадзілі ліпавую алею ў мемарыяльным комплексе «Дальва» ў Лагойскім раёне.

Як адзначыў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна, у гэты светлы цудоўны дзень у суботніку прыняло ўдзел шмат жыхароў Мінскай вобласці. Сапраўды, па папярэдніх падліках, гэта 382 тысячы чалавек. Плануецца пералічыць каля 900 тысяч рублёў.

Сяргей РУМАС садзіў лес ва Уздзенскім раёне.

Прадстаўнікі службаў, аддзелаў і падраздзяленняў Мінаблвыканкама прыводзілі ў належны стан мемарыяльныя комплексы «Курган Славы», «Хатынь».

Удзел у суботніку, што прайшоў у Мінскай вобласці, прынялі найвышэйшыя службовыя асобы і вядомыя людзі. У прыватнасці, **прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС** паўдзельнічаў у пасадцы лесу ў вёсцы Трысцянец Уздзенскага раёна, **старшыня Камітэта дзяржкантролю Леанід АНФІМАЎ** высадзіў дрэвы на тэрыторыі Лагойскага лясгаса. **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** залажыў «Алею Памяці» ў аграгарадку Сноў Нясвіжскага раёна. **Міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** добраўпарадкоўваў месца пахавання і саджаў дрэвы на сваёй малой радзіме ў аграгарадку Пухавічы.

МАГІЛЁЎШЧЫНА

Адной з асноўных пляцовак суботніка ў Магілёве стала сярэдняя школа ў мікрараёне Казіміраўка. Тут удзел у навядзенні парадку прынялі супрацоўнікі аблвыканкама на чале са старшынёй Леанідам ЗАЙЦАМ. Шматлікі працоўны дэсант з удзелам прадстаўнікоў абласной улады дапамог добраўпарадкаваць пасля рэканструкцыі тэрыторыю радзільнага дома Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі і прыбраць яго памяшканні ад будаўнічага смецця.

У Бабруйску заклалі парк з 700 дрэў на вуліцы Сікорскага, у магілёўскім парку «Падмаколле» прыбралі смецце і прывялі ў парадак газоны, добраўпарадкавалі ахоўную зону паблізу ад Палыкавіцкай крыніцы. **Міністр па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь Сяргей НАЛІВАЙКА** дапамог навесці парадак на тэрыторыі лячэбнага корпуса Бабруйскай гарадской дзіцячай бальніцы. А **міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ** заняўся пасадкай дрэў на тэрыторыі дэндрапарку ў Кіраўску.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар МАРЗАЛЮК і Аляксандр БАГДАНОВІЧ шчыравалі на медыцынскіх аб'ектах — першы ў Магілёве на тэрыторыі гарадской бальніцы, другі — у Асіповічах на пляцоўцы тэрапеўтычнага корпуса. **Старшыня праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў Валерый ІВАНОЎ** прыняў удзел у добраўпарадкаванні помніка на ўездзе ў горад Клімавічы.

— Суботнікі ў нас праходзяць рэгулярна з пачатку красавіка, яны адбыліся ўжо ва ўсіх буйных населеных пунктах і нават не па адным, — адзначыў **намеснік старшыні аблвыканкама Андрэй КУНЦЭВІЧ.** — Распрацаваны план мерапрыемстваў па навядзенні парадку. Аб'ём работ вялікі, і вельмі важна, каб кожны жыхар вобласці аднёсся да гэтай справы добрасумленна.

Удзел у рэспубліканскім суботніку прыняло каля 300 тысяч жыхароў вобласці. Агульнымі намаганнямі зарабілі каля 850 тысяч рублёў.

Фота Аляксея СПАТКАЯ.

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА разам са старшынёй Віцебскага аблсавета Уладзімірам ЦЯРЭНЦЬЕВЫМ працавалі ў віцебскім парку Тысячагоддзя.

Наталля КАЧАНАВА працавала ў Полацкім раёне.

ГРОДЗЕНШЧЫНА

Важна аддаваць увагу аднаўленню і захаванню для нашчадкаў гістарычных помнікаў. Такое меркаванне журналістам падчас рэспубліканскага суботніка выказаў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ, піша БелТА.

Удзел у суботніку прынялі каля 300 тысяч жыхароў рэгіёна.

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ залажыў «Алею памяці» ў Снове Нясвіжскага раёна.

Кіраўніцтва аблвыканкама працавала ў Старым замку ў Гродне. Зараз працягваецца рэстаўрацыя старажытнай каралеўскай рэзідэнцыі, за аснову для аднаўлення ўзяты замак часоў Стафана Баторыя. Першую чаргу работ плануецца завяршыць у 2020 годзе.

Прадстаўнікі аблвыканкама працавалі на заліванні маналітнай пліты на замкавым муры. Важна, што на кожным этапе работ у замку забяспечаны археалагічны нагляд. Таму некаторыя з удзельнікаў суботніка дапамагалі ў рабоце археолагам.

Акрамя Старога замка ў Гродне, удзельнікі суботніка працавалі і на іншых гістарычных аб'ектах рэгіёна. У тым ліку ў Навагрудскім і Любчанскім замках. Арганізавалі прыборку старадаўніх паркаў у Воранаўскім раёне. У Смаргонскім раёне работы вяліся ў сядзібе Міхала Клеафаса Агінскага ў вёсцы Залессе. Добраўпарадкоўваліся таксама тэрыторыі, якія прымыкаюць да Крэўскага і Гальшанскага замкаў.

ГОМЕЛЬШЧЫНА

Больш як 20 клёнаў пасаджаны ў раёне возера Бурае Балота ў Гомелі. Яны далі пачатак парку сямейных дрэў.

Саджалі дрэвы і добраўпарадкоўвалі тэрыторыі паўсюдна. Фруктовы сад «Яблыневы колер — знак Перамогі» з'явіўся каля помніка дзяўчатам-зенітчыцам у Гомелі. Новыя пасадкі і на мемарыяльным комплексе Курган Славы ў Мазыры.

Да работы далучыліся прадстаўнікі ўлады. Дрэвы ўздоўж каскада азёр «Валатава» ў Гомелі пасадзіў **міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр ЦЕРАХАЎ. Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ШУЛЕЙКА і намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ЖАЎНЯК** высаджвалі расліны ў гарадскім парку ў Хойніках. **Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ** займалася добраўпарадкаваннем тэрыторыі славутага Гомельскага палацава-паркавага ансамбля.

На Гомельшчыне на суботнік выйшлі 430 тысяч яе жыхароў, якія зарабілі 1 мільён 300 тысяч рублёў.

БРЭСТЧЫНА

У Брэсцкай вобласці на рэспубліканскі суботнік выйшла звыш 400 тысяч жыхароў. Найбольш людзей было задзейнічана на аб'ектах добраўпарадкавання. Садзілі дрэвы, прыбіралі паркі і скверы, зоны адпачынку.

Абласны цэнтр актыўна прыхарошваецца да будучага святкавання юбілею. Сотні людзей прыйшлі на так званыя аб'екты тысячагоддзя. Дэпутаты гарадскога Савета разам з актывістамі маладзёжнага парламента пасадзілі дрэвы на самым уездзе ў горад з боку трасы М1. Абласная пракуратура, МНС, аблваенкамат шчыравалі на тэрыторыі крэпасці, прыводзілі ў парадак ваколіцы археалагічнага музея «Бярэсце». Супрацоўнікі апаратаў абл- і гарвыканкама працавалі на добраўпарадкаванні ўчастка Заходняга абходу на скрыжаванні вуліц Гогаля і Зубачова.

Працоўны дэсант на чале са старшынёй аблвыканкама Анатолем ЛІСАМ працаваў на будаўніцтве школы ў мікрараёне ПЗМР-2 у Зарэчным раёне горада. Губернатар расказаў журналістам, што школа, разлічаная амаль на 1,5 тысячы месцаў, будзе ўведзена ў строй да пачатку новага навучальнага года.

Фота БелТА.

Дзівоснае побач

У Васілісы і Анфісы з'явілася сяброўка Маша

На ўскрайку лесу каля вёскі Жасцінае, што ў Лагойскім раёне, днямі знайшлі маленькае медзведзяня. Яго выпадкова заўважыў мясцовы жыхар і патэлефанаваў у Лагойскі раённы аддзел унутраных спраў, раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях, а таксама ў інспекцыю прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

logovsk.by

У раёне была створана камісія, прадстаўнікі якой выехалі на месца. Спецыялісты вызначылі, што малому ўсяго паўтара месяца. І яно не можа пра сябе паклапаціцца. Што сталася з яго маці, невядома, разгадаць гэтую таямніцу спрабуюць паляўніцтвазнаўцы. Немаўля перадалі ў заасад цэнтра экалагічнага турызму «Станькава».

— Медзведзяня агледзелі ветурачы. Яно здаровае, аднак вельмі худое, відаць, доўга галадала, — расказаў «Звяздзе» **загадчык заасада Міхаіл ТУРЫГІН.**

— А куды паселіце новага жыхара?

— Вальер пакуль не ўладкавалі. Гуляе ў пакоі з нашымі работнікамі. Аказалася, што гэта дзяўчынка. Да нас яна ўжо прыехала з імем. У Лагойскім раёне яе назвалі Машай. Вельмі жвавая, актыўная наша Маша, — кажа Міхаіл Пятровіч. — Калі што не па ёй, то рыкае, можа і цапнуць.

«Звязда» некалькі гадоў таму пісала пра аналагічны выпадак. Два хлопцы ў Барысаўскім раёне ехалі на машыне і ўбачылі, што паўз поле з пасеянай грэчкай нехта бяжыць, напачатку думалі, гэта сабака. Выйшлі з кабіны, прыгледзеліся — медзведзяня. Малое забралі дадому і паведамілі пра гэта ў інспекцыю прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя. Яго прытулілі таксама ў Станькаве і назвалі Васілісай. Для яе зрабілі прасторны вальер з фантанам і дрэвам пасярэдзіне. Але Васіліса была надта баязлівая, хавалася ў кутку, не выходзіла нават есці. І тады работнікі заасада падсялілі да яе шчанюка Анфісу, якая дапамагла мядзведзіцы адаптавацца да нязвыклых умоў. Васіліса і Анфіса моцна пасябравалі і з таго часу жывуць дружна, як адна сям'я.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Атракцыёны рыхтуюцца да лета

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Атракцыён — абсталяванне сезоннае, складанае. На зіму яго, як правіла, кансервуюць. Але падрыхтоўка да лета пачынаецца яшчэ ў сакавіку. Працэс гэты займае не адзін дзень — вытворцы прадугледзелі цэлы комплекс рэгламентных работ па тэхнічным абслугоўванні. Агляд экспертам Дзяржпрамнагляда — гэта фінал. Менавіта спецыяліст робіць заключэнне, ці здольны атракцыён катаць наведвальнікаў (вядома ж, пры выкананні правіл тэхнікі бяспекі) або яго неабходна адпраўляць на рамонт.

— Сёлета заяўкі сталі актыўна паступаць да нас пасля 12 красавіка, — працягвае Генадзь Румкін. — Але яшчэ ў пачатку месяца мы правялі ў парку Чалюскінцаў выязную нараду з прадстаўнікамі Мінскзялёнбуда, каб зняць усе арганізацыйныя пытанні дзеля таго, каб атракцыёны прад'яўляліся дзяржаўнаму нагляду ў ступені поўнай гатоўнасці. Зараз эксперты і інспектары ацэньваюць тэхнічны стан атракцыёнаў. У нас задзейнічана сем чалавек. Пастаўлена задача выканаць усе работы да 24 красавіка. Таму мы будзем працаваць і на выхадных.

Але колькі часу патрабуецца на агляд?

— Адназначна сказаць нельга. Усё залежыць ад складанасці атракцыёна. Менавіта завод-вытворца пазначае ў суправаджальнай дакументацыі схему і метадалогію дыягностыкі. Напрыклад, возьмем «Джамба джэт». Гэта так званыя амерыканскія горкі. Ён прадугледжвае ўздым на вышыню — максімальны пад'ём цягніка складае 14 з паловай метраў. А гэта, на хвіліначку, узровень пятага паверха. Таму тут мы правядзём больш часу. А вось побач з намі — стары добры «Вальс», які быў зроблены ў 1992 годзе і за гэты час адкатаў ужо цэлае пакаленне людзей. Ён больш просты.

Спецыялісты Дзяржпрамнагляда звяртаюць увагу падчас агляду атракцыёна на многія фактары. Сярод іх — карэктная работа вузлоў, узровень шуму. Калі выпрабаванне і агляд скончыліся ўдала, то атракцыён атрымлівае допуск на эксплуатацыю з адпаведнай пазнакай у яго пашпарце. Як правіла, на адзін год. Наступнай вясной усё трэба будзе рабіць нанова.

Па досведзе мінулых гадоў не ўсе механічныя забаўкі атрымліваюць «дабро» з першага ж разу. Пытанні выклікаюць часцей за ўсё элементы мацавання і некаторыя арганізацыйныя моманты. Але, як правіла, уладальнікі імкнуцца іх вырашаць актыўна і хутка.

Замест пасажыраў — мяшкі з пяском.

— Пытанне асаблівага кантролю — атракцыёны, якія адпрацавалі нарматыўны тэрмін службы, — кажа Генадзь Румкін. — Яго ўстанаўлівае завод-вытворца адпаведным запісам у пашпарце. Як правіла, гэта 15 гадоў. Калі ж прадпрыемства, дзе зрабілі забаўку, не пазначыла гэтыя даныя, то тэрмін эксплуатацыі разлічваецца ў 10 гадоў у адпаведнасці з нашымі нарматыўнымі дакументамі.

А як хутка будуць абнаўляцца сталічныя атракцыёны? **Галоўны інжынер УП «Мінскзялёнбуд» Уладзімір БАБІЎСКІ** адказвае, што старыя агрэгаты замяняцца будуць. Але ў адзінкавых выпадках.

— Летась былі зманціраваны і пушчаны ў эксплуатацыю тры новыя атракцыёны, якія належаць прыватным уладальнікам. Мы таксама закупілі некалькі забавак, але яны не механізаваныя. У батутным комплексе і дзіцячым лабірынце няма ні вышыні пад'ёму з пасажырамі, ні лінейнай хуткасці паскарэння. Але трэба ўлічваць і тое, што атракцыён — штука вельмі дарагая. Сярэдні яго кошт у залежнасці ад складанасці — ад аднаго да двух мільёнаў рублёў. Таму абнаўляць іх парк адразу пасля заканчэння нарматыўнага тэрміну эксплуатацыі, мякка кажучы, накладна. Так, існуе праграма па замене атракцыёнаў, але яна скіравана на адзінкавыя выпадкі. Тут трэба звярнуць увагу на адну рэч. Той жа Парк Чалюскінцаў з усёй сваёй інфраструктурай складваўся гістарычна, і многія людзі прыходзяць сюды, каб хоць на непрацяглы час вярнуцца на некалькі гадоў назад, у тым ліку і з дапамогай атракцыёнаў. Мы гэта бачым па запатрабаванасці механічных забавак. Але і неабходнасці ў тым, каб пашыраць парк атракцыёнаў, змешчаных тут, пакуль таксама няма.

— Атракцыёны-«ветэраны» праходзяць абавязкова праз тэхнічнае дыягнаставанне, — працягвае Генадзь Румкін. — Робяць іх арганізацыі, якія маюць адпаведныя ліцэнзіі Дзяржпрамнагляда. Яны выконваюць прыборны кантроль, правяраюць усе вузлы, зварныя стыкі, агульны стан канструкцый... І толькі пасля станоўчага дыягнастычнага заключэння да тэхнічнага асведчання падключаюцца ўжо нашы эксперты.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота аўтара.

Надвор'е

І ЗНОЎ СУХА...

Тэмпература паветра на гэтым тыдні будзе падымацца да 24 цяпла

Даволі цёплае і без дажджоў надвор'е чакаецца ў нашай краіне ў найбліжэйшы час, паведамляюць сіноптыкі. У сувязі з гэтым на большай частцы тэрыторыі краіны на гэтым тыдні ўсталюецца высокі клас пажаранебяспекі.

У наступныя двое сутак наша краіна застанецца на заходняй перыферыі ўсходняга антыцыклону, які размясціўся над цэнтральнымі раёнамі еўрапейскай часткі Расіі. У сераду чакаецца пераменная воблачнасць і таксама будзе без ападкаў. Вецер прагназуецца паўднёва-ўсходні, уначы ўмераны, удзень парывісты, у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 цяпла, у асобных раёнах — ад мінус 1 да плюс 1 градуса. Удзень будзе ад плюс 16 градусаў да 21 цяпла. У чацвер чакаецца пераменная воблачнасць, будзе пераважна без ападкаў, але ўначы стане цяплець. Вецер прагназуецца паўднёва-ўсходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—10 цяпла, удзень — ад плюс 18 градусаў да плюс 24 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ

об открытом аукционе по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Кобринском районе Брестской области 28 мая 2019 года в 11.00

№ лота	Адрес земельного участка	Целевое назначение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.	Затраты на организацию и проведение аукциона, руб.
1	ул. Текстильщиков, 24, п. Фруктовый, Батчинский сельсовет	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки)	124380404601000306	0,1295	Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения	5000	500	2010,74*
2	ул. Текстильщиков, 26, п. Фруктовый, Батчинский сельсовет	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки)	124380404601000305	0,1320	Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения	5200	520	2010,74*

Дополнительно возмещаются расходы на публикацию извещения в СМИ

Организатор аукционов – Кобринский районный исполнительный комитет

Аукцион состоится 28 мая 2019 года в 11.00 по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.
Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.
Последний день приема заявлений – 22 мая 2019 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.

Продажа земельных участков осуществляется гражданам Республики Беларусь.
К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
На основании подпункта 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, предоставленному для строительства одноквартирного жилого дома в районах индивидуальной жилой застройки, подлежат возмещению в порядке, установленном Положением о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 1 апреля 2014 г. № 298.
Затраты, возмещаемые победителем аукциона, являющимся застройщиком жилого дома, возмещаются при выдаче разрешительной документации на возведение одноквартирного жилого дома либо до ввода в эксплуатацию жилого дома с учетом индексации.
Ориентировочная величина затрат, возмещаемых гражданином, являющимся застройщиком жилого дома при выдаче разрешительной документации на возведение одноквартирного жилого дома составляет:
– по лоту № 1 – 4526,94 рубля;
– по лоту № 2 – 4569,51 рубля.
Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте http://kobrin.brest-region.gov.by

ИЗВЕЩЕНИЕ

об открытом повторном аукционе по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Кобринском районе Брестской области 28 мая 2019 года в 11.30

№ лота	Адрес земельного участка	Целевое назначение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.	Затраты на организацию и проведение аукциона, руб.
1	ул. Дружная, 1, д. Андроново, Батчинский сельсовет	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки)	124380400101000386	0,1585	Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения	3000	300	1274,44*

Дополнительно возмещаются расходы на публикацию извещения в СМИ

Организатор аукционов – Кобринский районный исполнительный комитет

Аукцион состоится 28 мая 2019 года в 11.30 по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.
Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.
Последний день приема заявлений – 22 мая 2019 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.

Продажа земельного участка осуществляется гражданам Республики Беларусь.
К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, не возмещаются.
Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте http://kobrin.brest-region.gov.by

ИЗВЕЩЕНИЕ

об открытом аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков в Кобринском районе Брестской области 28 мая 2019 года в 12.00

№ лота	Адрес земельного участка	Целевое назначение земельного участка	Срок аренды земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.	Затраты на организацию и проведение аукциона, руб.
1	ул. Советская, аг. Остромичи, Остромичский сельсовет	Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли)	10 лет	124385007601000541	0,0040	Обеспеченность (возможность подключения) газоснабжения, водоснабжения, электроснабжения, асфальтированный подъезд	200	20	2241,54*
2	ул. Торговая, 1, г. Кобрин	Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли)	10 лет	124350100001005345	0,0070	Обеспеченность (возможность подключения) газоснабжения, водоснабжения, электроснабжения, асфальтированный подъезд	2500	250	*

Дополнительно возмещаются расходы на публикацию извещения в СМИ

Организатор аукциона – Кобринский районный исполнительный комитет

Аукцион состоится 28 мая 2019 года в 12.00 по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.
Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.
Последний день приема заявлений – 22 мая 2019 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.

Продажа права заключения договора аренды земельного участка осуществляется индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам.
К участию в аукционе допускаются индивидуальные предприниматели, юридические лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо), подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Победителем аукциона в обязательном порядке вносится плата за право аренды и ежегодная арендной платы за земельный участок, находящийся в государственной собственности. При продлении арендных отношений в обязательном порядке вносится плата за право аренды.
На земельном участке по ул. Торговой, 1, в г. Кобрине (лот № 2) установлен торговый павильон, который будет демонтирован собственником этого некапитального строения до обращения победителя аукциона, не являющегося собственником этого строения, за государственной регистрацией прав на земельный участок.
Годовая арендная плата на дату проведения аукциона составляет:
по лоту № 1 – 1,55 рубля;
по лоту № 2 – 56,43 рубля.
Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте http://kobrin.brest-region.gov.by

УНП 200042468

НАСЕЛЬНІКІ ВАДАЁМАЎ — НА МАРКАХ

З 17 красавіка Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі выпушчаны ў абарачэнне чатыры паштовыя маркі з серыі «Насельнікі вадаёмаў Беларусі».

Гэтым разам на іх трапілі плывунец аблямаваны, колюшка трохіголкавая, рачны вузкапальцы рак і жыварод-ка балотная.

Тыраж марак складае 56 тысяч экзэмпляраў.

ПІШЫЦЕ ЛІСТЫ

Беларускі маладзёжны конкурс сачыненняў эпісталярнага жанру прайшоў сёлета ўжо дваццаць трэці раз. Праводзіцца ён сярод школьнікаў. У фінал выйшлі сем пасланняў, прысвечаных тэме свайго героя. Прапанаваў яе па традыцыі Сусветны паштовы саюз. На гэты раз у Швейцарыю адправіцца вучань магілёўскай сярэдняй школы № 18 Уладзімір Грабараў. У журы, якое ацэньвала творы, быў запрошаны і карэспандэнт «Звязды».

Сем работ да таго перамаглі ў кожнай з абласцей і ў Мінску. Школьнікі пісалі пра Ніка Вуйчыча, касманаўта Аляксея Лявонава, музыканта Кевіна Дэйла... Але больш за ўсіх членаў журы крануў аповед пра Мішу Мароза, вучня Аршанскага педагагічнага вучылішча. Недзе ў канцы 1970-х гадоў ён працаваў у калгасе разам з іншымі хлопцамі. Дапамагаў убіраць бульбу. І вось на транспарцёр камбайна трапіў іржавы снарад. Міша хуценька зняў яго з ленты і панёс у бок рва, каб выкінуць. Але адбыўся выбух. Міша загінуў на месцы, але выратаваў сваіх сяброў.

Неўзабаве сачыненне будзе перакладзена на англійскую мову і адпраўлена ў Берн, каб пазмагацца за вікторыю. Аўтары шасці астатніх работ атрымаюць памятныя падарункі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Профі

ПАШТАЛЬЁНЫ БЫВАЮЦЬ І МАБІЛЬНЫЯ

Выстаўка «ТІБО-2019» — гэта магчымасць для вядучых тэхнічных карпарацый прадэманстраваць свае найноўшыя распрацоўкі. Натуральна, што яна прыцягвае да сябе шмат інтарэсу з боку наведвальнікаў. «Белпошта» таксама не выпала з мэйнстрыму. Сёлета стэнд нацыянальнага паштовага аператара быў прысвечаны адразу дзвюм тэмам. У год 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў як жа не згадаць пра адзін з найважнейшых складнікаў войска — палявую пошту, якая дазваляла байцам падтрымліваць сувязь з роднымі і блізкімі? Канешне ж, паштавікі паказалі і свае тэхнічныя цікавінкі, якія неўзабаве ўвойдуць у прафесійны побыт.

— Аднайменны паштовы блок уведзены ў абарачэнне сёлета, у першы дзень работы выстаўкі, — кажа **начальнік выдавецкага цэнтра «Марка» РУП «Белпошта» Ірына ШАПІЛАВА.** — На ім адлюстраваны танкетка атрада імя С. М. Кірава 37-й партызанскай брыгады Мінскай вобласці і знакамітая сцэна з архіўнай хронікі, дзе 3 ліпеня 1944 года жыхары Мінска вітаюць савецкіх воінаў-вызваліцеляў. У аснове спецштэмпеля — фрагмент скульптурнай кампазіцыі манумента «Беларусь партызанская». Ён надрукаваны тыражом 20 тысяч экзэмпляраў.

Выпуск гэты незвычайны. Упершыню да паштовага блока была выкарыстана тэхналогія дапоўненай рэальнасці, якой можа скарыстацца ўладальнік любога смартфона, што працуе на аперацыйнай сістэме Android. У Google Play Market даступная для спампоўвання бясплатная праграма AR MARKA BELARUS.

Наводжу на карцінку камеру свайго смартфона. Праходзіць дзве-тры секунды — і на экране ўзнікае сюжэт, нібыта з камп'ютарнай гульні. Па дарозе ідуць танкі. Уверсе экрана з'яўляецца невялікі тэкст, які распавядае пра гэты паштовы блок. З дынамікаў раздаецца гук руху танкавай калоны.

Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** внести плату за право заключения договора аренды предоставляемого земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона; возместить в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участниками документации, необходимой для его проведения; возместить в установленном порядке убытки Витебскому горисполкому, причиняемые нарушением функционирования мелиоративных сооружений, в сумме: 1666 белорусских рублей (по лоту № 1), 1770 белорусских рублей (по лоту № 2); заключить с Витебским горисполкомом договор аренды зем. участка; в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона, в установленном порядке обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; обратиться в установленном порядке за получением разрешительной документации на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца, с момента гос. регистрации права на зем. участок; при необходимости привлечь инженерную организацию (инженера) для оказания инженерных услуг в строительстве в порядке и на условиях, предусмотренных законодательством и договором на оказание инженерных услуг; выполнить работы по подготовке проектной документации при условии заключения в установленном порядке договора подряда на проведение проектных и изыскательских работ, в срок до одного года со дня гос. регистрации права на зем. участок; разработать проектно-сметную документацию в соответствии с действующими техническими нормативными правовыми актами; согласовать проектно-сметную документацию с главным архитектором г. Витебска; при необходимости провести гос. экспертизу проектно-сметной документации. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Контактные тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Национальному центру интеллектуальной собственности на праве оперативного управления

Лот № 1, состав: 1. Административное помещение, инв. № 500/D-7026342, площадь – 3524,3 кв. м, этаж – 1-3, мансарда, г. п. – 1939. 2. Помещение, не относящееся к жилищному фонду, расположенное в подвале, инв. № 500/D-7026343, площадь – 424,4 кв. м. 3. Складское помещение, расположенное в подвале, инв. № 500/D-7026344, площадь – 278,3 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Захарова, 42, помещение 12, 13, 14 (соответственно). **Начальная цена – 216 863,31 бел. руб. без НДС. Задаток – 30 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

Условия аукциона: 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней с назначенной даты проведения аукциона. 2. Оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 5 (пяти) банковских дней с момента подписания договора купли-продажи. 3. Отчуждение Объекта производится для использования его Победителем аукциона (Претендентом на покупку) после реконструкции или реставрации Объекта последним. 4. Возместить Продавцу стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона в размере 7000,00 (семь тысяч белорусских рублей 00 копеек) с учетом НДС 20 % в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. 5. Возместить Организатору аукциона стоимость затрат Организатора аукциона в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона

Размер штрафа, в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609, составляет 40 000,00 бел. руб.

Аукцион состоится 28.05.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: Национальный центр интеллектуальной собственности, г. Минск, ул. Козлова, д. 20, тел. 8 (017) 294-36-56. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 4.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 28.05.2019 г. (Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 24.05.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Мезга Сергей Ильич, тел. 8 (029) 704-99-38

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

Запрашальнік

ДЗЕ ХАВАЕЦЦА БЕЛЫ СЛОН?

Насамрэч «Белы слон» — гэта квэст (гульня), падрыхтаваны супрацоўнікамі Мірскага замка для ўсіх ахвотных. Ён напэўна ж прыйдзецца да густу аматарам таямніц і загадак.

Амаль 100 гадоў Мірскі замак захоўвае гісторыю пра Белага слана. І вось прыйшоў час адкрыць заслону невядомасці і даведацца неверагодную гісторыю, якая доўгі час была забытая...

Удзельнікаў гульні чакаюць няпростыя выпрабаванні на логіку і кемлівасць і, вядома, на веданне гісторыі замка. Толькі прайшоўшы нялёгкі шлях складаных загадак, можна будзе даведацца, пра якога Белага слана ідзе размова.

Варта адзначыць, што гэта не першая гульня, якая ладзіцца ў замку. Летась госці старажытнага мура разгадвалі «Таямніцу двух куфраў». Справа ў тым, што падчас правядзення рамонтных работ уладальнік Мірскага замка князь Міхаіл Святаполк-Мірскі знайшоў стары куфар, які на працягу некалькіх стагоддзяў знаходзіўся ў адным са склепаў. З запіскі, знойдзенай побач з куфрам, вынікала, што гэты скарб схаваў князь Караль Станіслаў Радзівіл «Справядлівы» падчас вайны са шведамі. Удзельнікам гульні трэба было дапамагчы адкрыць гэты куфар. Таксама яны мелі магчымасць дапамагчы кухару прыгатаваць страву для князя. Вось такая нясумная гісторыя!

Варвара ГОМАН.

Спадчына ў законе

СПРАВА АБ ВАЙСКОВЫХ МОГІЛКАХ

Суд Фрунзенскага раёна Мінска прызначыў штрафы спецкамбінату

5 ліпеня 2018 года «Звязда» пісала пра праблемы добраўпарадкавання сталічных Вайсковых могілак, якія з'яўляюцца дзяржаўным помнікам гісторыка-культурнай спадчыны першай (найвышэйшай) катэгорыі. Нашаму карэспандэнту давялося на свае вочы пабачыць, як супрацоўнікі спецкамбіната бытавога абслугоўвання насельніцтва пад выглядам навядзення парадку зрываюць старыя, але па-ранейшаму вельмі трывалыя, і да таго ж каларытныя надмагільныя пліты. Дэмантажу падлягала нават тое, што вонкава было ў вельмі добрым стане. На шчасце, абурэнне і голас грамадскасці быў пачуты. Тым, што адбываецца на Вайсковых могілках, зацікавіліся ў пракуратуры. А днямі адбылося судовае пасяджэнне. Па яго выніках спецкамбінату было прысуджана некалькі штрафаў.

У афіцыйным судовым паведамленні гаворыцца, што вынесена рашэнне аб маральнай кампенсацыі па грамадзянскай справе па іску Даната Яканюка, Ірыны Маркевіч і Анжалікі Сяргеевай — гэта тыя людзі, надмагіллі чыіх сваякоў былі парушаныя. Былі знішчаныя крыжы, агароджы і надмагільныя збудаванні на магілах іх продкаў.

Істцы з'яўляліся прамымі нашчадкамі асоб, пахаваных на Вайсковых могілках у сталіцы. На могілках знайшлі апошні спачын родныя Даната Яканюка: яго дзед — протаіерэй Андрэй Тураўскі і маці — Варвара Яканюк (Тураўская); у Ірыны Маркевіч гэта дзед Язэп Матусевіч, у Анжалікі Сяргеевай — бабуля Вера Сіліна і маці Клара Сяргеева.

Нашчадкі надмагіллі продкаў даглядалі — у парадку былі і пліты, і агароджы — пры патрэбе яны своечасова рамантаваліся ці падфарбоўваліся. Прыбіралася смецце, належным чынам даглядаліся клумбы. Нягледзячы на ўсё гэта ў сярэдзіне 2018 года без папярэджання і ўзгаднення магілы продкаў былі дэмантаваныя, а крыжы, агароджы і надмагільныя збудаванні знішчаныя.

«Такім чынам, — гаворыцца ў судовым рашэнні, — дзейнасцю спецкамбіната ім былі нанесеныя глыбокія маральныя пакуты, памяць пра продкаў была знішчаная, магілы разбураны, а пачуцці абражаныя. Здзейснены факт надмагільнага вандалізму апаганіў духоўныя традыцыі іх сем'яў. Усведамленне таго, што родныя цяпер спачываюць па-за праваслаўным вераваннем, а іх пахаванні, па сутнасці, знішчаны, увагналі істцоў у стан непраходзячага маральнага стрэсу, што ўзбудзіла ў іх справядлівае імкненне абараніць памяць спачылых, аднавіць сямейныя помнікі як неад'емную частку традыцый пахавання. Тое, што адбылося, не магло не адбіцца на фізічным і псіхалагічным стане, парушыўся сон, абвастрыліся ўзроставыя захворванні, а адчуванне горычы і несправядлівасці за цынічныя адносіны да духоўнай памяці будуць пераследаваць істцоў усё жыццё».

Такім чынам, істцы прасілі спагнаць з адказчыка кампенсацыю маральнага ўрону ў памеры 10 000 рублёў на карысць кожнага істца і судовыя выдаткі. Суд пастанавіў камбінату бытавога абслугоўвання выплаціць кожнаму істцу маральную кампенсацыю ў памеры 1000 рублёў, таксама аплаціць юрыдычную дапамогу і дзяржаўныя пошліны.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ, фота аўтара.

За тым, што адбывалася на Вайсковых могілках летам 2018 года, было балюча назіраць і карэспандэнту «Звязды».

Шануй сваё!

«Лявоніха» па-тутэйшаму

Кожнае па танца запісвае вядомы беларускі этнахарэограф Мікалай КОЗЕНКА. Ён — аўтар шматлікіх праектаў захавання фальклорнай і танцавальнай спадчыны.

«Яблычка» ды «Мікіта», «Чобаты» ды «Жабка» — так завуцца традыцыйныя беларускія танцы, здаўна вядомыя і прызнаныя. Але ж самым папулярным сёння застаецца «Лявоніха». Як выглядаюць гэтыя танцы, як гучаць іх мелодыі можна было днямі ўбачыць і пачуць у актавай зале сярэдняй школы № 71 Мінска, дзе праходзіў конкурс «Ветразь 2019» (галоўныя заснавальнікі — Беларускі фонд культуры і мінскі Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь»).

Амаль трыццаць народных танцаў былі прадстаўленыя на суд кампетэнтнага журы. Знаўцы ацэньвалі пластыку рухаў, кампазіцыю танца, адпаведнасць выканання мясцовым традыцыям. Менавіта гэтыя традыцыі былі галоўнай «разынкай» выступленняў. Танцавальныя пары і салісты паказвалі чым, напрыклад, здаўна адрозніваліся полечка з-пад Слуцка ад сваёй вясёлай сястры з-пад Бабруйска. Танец «Мікіта», у якім неабходна па-майстэрску скакаць над скрыжаванымі кіёчкамі, у розных мясцовасцях таксама можа выглядаць то па-дзіцячы проста, то гарэзліва, разлічаным на фізічныя здольнасці падлеткаў. Майстэрства пар і салістаў-імправізатараў было зафіксаванае ў відэазапісах, якія стануць выдатнымі метадычнымі матэрыяламі і часткай каштоўнага архіва народнага мастацтва.

Як зазначыў доктар філасофскіх навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Энгельс Дарашэвіч, аўтэнтыка выратуе свет. Калі ўсе зразумеюць, што трэба любіць свой народ і сваю культуру — людзі будуць прыязна ставіцца да іншых народаў і культур, знойдуць паразуменне паміж сабой. Конкурс беларускага народнага танца «Ветразь» — значны ўклад у гэту выратавальную справу.

Цікава было і малым, і старым.

А яшчэ трэба зазначыць, што названае свята народнага танца ўзнаўляе ў памяці генетычны код нашай старадаўняй культуры. Нездарма яно стала важным складнікам шматгадовага, вядомага далёка за межамі Беларусі, фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня».

Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.

Завіхурыла «Лявоніха».

У руках юных музыкаў са Смаргоні традыцыйныя народныя інструменты.

ПАНТЭОН АЙЧЫНЫ

Леў Сапега

(1557—1633)

Жыццёвым дэвізам для Льва Сапегі было перакананне: «Не толькі я, але і жыццё маё належыць Айчыне». Сапраўды, ён цалкам прысвяціў Айчыне сябе і свой талент дзяржаўнага дзеяча. Сапега прайшоў шлях ад велікакняжацкага сакратара пры Стафане Баторыі да канцлера, віленскага ваяводы, нарэшце вялікага гетмана літоўскага.

На плечы Льва Сапегі ўскладаліся самыя адказныя місіі — ці гэта ўсмірэнне непакорлівых жыхароў Рыгі і Віцебска, цяжкія пасольствы ў Маскву, выбранне рускім царом каралевіча Уладзіслава, абарона Лівоніі ад шведскіх войскаў і шмат іншых спраў, якія ён, умелы адміністратар, разважлівы палітык, дасведчаны дыпламат ажыццяўляў з карысцю для сваёй краіны. Але перш за ўсё імя Льва Сапегі звязана з Трэцім Статутам Вялікага Княства Літоўскага. Работу над гэтым найлепшым на той час зводам законаў у Еўропе Сапега пачаў яшчэ ў маладосці, калі служыў у велікакняжацкай канцылярыі. Малады пісар, юрыдычныя веды якога ўразілі Баторыя, зрабіўся незамянімым памочнікам канцлера Яўстафія Валовіча і падканцлера Крыштофа Радзівіла, якія працавалі над стварэннем вышэйшага апеляцыйнага суда — Трыбунала ВКЛ. Стаўшы падканцлерам, а пасля і канцлерам, Леў Сапега ўзначальваў соймавую камісію па складанні новага зводу законаў ВКЛ. Артыкулы Статута абмяркоўваліся на павятовых соймiках і агульнадзяржаўных з'ездах. Такім чынам, Статут быў плёнам заканадаўчай думкі «шляхецкага народа» ВКЛ. Агульную рэдакцыю канчатковага варыянта рабіў Леў Сапега, і гэтая праца вымагала не толькі руплівасці, але добрых ведаў і палітычнай тактоўнасці. Адны хацелі аднаго, другія — другога. «Усе аднадушныя ў тым, каб браць за прыклад найлепшае. Іншы раз самі не ведаюць, чаго хочуць. Калі пытаюся, як хочаш, каб гэта было, дык адказвае: «Сам не ведаю, як перадаць тое, што думаю». Злы дух цябе пабраў бы, калі я абавязаны разумець тваю фантазію, калі ты сам не можаш яе выказаць! Ужо так мне ўсё надакучыла, што сам не ведаю, ці вытрымаю», як сведчылі сучаснікі, падчас скрухі прызнаўся Сапега. Не толькі вытрымаў, але справіўся выдатна з гэтай нялёгкай задачай.

Сапега выступіў прыхільнікам прававога грамадства і краіны. У прадмове да Статута ён пісаў: «А где опять право або статут гору маеть, там сам Бог всим владиеть». На думку Сапегі, кожны чалавек павінен вызначаць тыя прававыя нормы, якія б пачціва ўзвышалі яго і засцерагалі ад ганебных учынкаў. А для дзяржавы зарукай яе росквіту і велічы ёсць якраз прававы лад. Відавочна, што гуманістычныя погляды Сапегі паўплывалі на гуманны характар многіх артыкулаў. Чалавек нават простага стану — «паспаліты» — гэта «Божье створенье», што вымагала і адпаведнай пашаны да яго. Гэтак у аснову законаў ВКЛ былі пакладзены хрысціянскія прынцыпы. Статут абвяшчаў роўнасць усіх перад законам, усе павінны судзіцца «тым одным правом писаным».

У палітычным аспекце Статут абвяшчаў ВКЛ самастойнай дзяржавай і скасоўваў шэраг пастаноў Люблінскай уніі, што абмяжоўвалі яе суверэнітэт. Як сапраўдны «міласнік Айчыны» Леў Сапега з гонарам пісаў у прадмове да Статута: «А если которому народу в стыд прав своих не имети, поготовно нам, которые не обчим яким языком, але своим власным права списаные маем и каждого часу чого нам потреба ку отпору всякое крывды, ведати можем». Сам факт напісання Статута «власной» мовай робіць яго культурным здабыткам беларусаў, іх вялікай кнігай, па законах якой яны жылі аж да сярэдзіны XIX стагоддзя. Трэба адзначыць, што Статут на працягу 200 гадоў быў самым дасканалым зводам законаў у Еўропе і адным з самых дэмакратычных, які паўплываў на заканадаўства іншых краін, у прыватнасці Рускага царства.

Вельмі значная роля Льва Сапегі і ў зацвярджэнні Статута ў 1588 годзе. Ён разам з менскім кашталянам Янам Глябовічам умела выкарысталі барацьбу выбранага палякамі манархам Рэчы Паспалітай Жыгімонта Вазы са сваім канкурэнтам аўстрыйскім эрцгерцагам Максіміліянам Габсбургам. За падтрымку ў гэтай барацьбе і прызнанне літвінамі яго вялікім князем літоўскім Жыгімонт Ваза ў абыход сойма зацвердзіў Статут. Сапега і Глябовіч атрымалі бліскучую дыпламатычную перамогу. Сам жа Сапега на свае сродкі і надрукаваў Статут у віленскай друкарні братоў Мамонічаў (былых магілёўскіх мяшчан).

Шмат якія аспекты дзейнасці Льва Сапегі працягваюць увагу і цікавасць даследчыкаў, ды і проста аматараў айчыннай гісторыі. Не да канца высветлена роля Льва Сапегі ў падзеях «Смутнага часу» Маскоўскага царства першай паловы XVII стагоддзя, яго сувязі з Ілжэдзмітрыямі. Рускі гісторык Сяргей Салаўёў лічыў Сапегу ледзь не галоўным завадатарам смуты, але сам Леў апраўдаўся перад гісторыяй, гнеўна асудзіўшы на сойме сапраўдных зачыншчыкаў гэтых падзей. Наадварот з Маскоўскім царствам Сапега марыў заключыць унію і стварыць моцную славянскую кааліцыю супраць пратэстанцкай Швецыі і мусульманскіх Турцыі і Крыма. Яго праект уніі, якую ён прапаноўваў у 1600 годзе цару Барысу Гадунову падчас пасольства ў Маскву за дэмакратычны характар (свабода веравызнання, гандлю, выбарнасць манарха і г. д.) не прынялі маскоўскія баяры. Магчыма, таму Сапега праз свайго стаўленіка ў Маскве Аляксандра Гансеўскага, які верхаводзіў баярскай думай, спрыяў выбранню ў 1610 годзе царом каралевіча Уладзіслава Вазы ў надзеі, што ён ажыццявіць унію паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам. Але падзеі разгарнуліся іначай, чым таго хацеў Сапега. Уладзіслаў так і не вянчаўшыся на царства, быў звергнуты. Што ж, не ўсё ўдаецца зрабіць, нават вялікім, і не ўсе зробленае з цяжкімі намаганнямі прыносіць жаданы плён. Але вялікія не зацыкліваюцца на няўдачах і на крыўдных паражэннях. Часам сам факт іх дзейнасці мае станоўчы характар і дапамагае выправіць цяжкае становішча. Так было ў 1617 годзе, калі Швецыя пачала вайну супраць Рэчы Паспалітай за Лівонію, Жыгімонт Ваза перадаў Льву Сапегу гетманскую булаву. Сапега разумеў, што не з-за таленту палкаводца ён прызначаны вялікім гетманам, а з-за «незлічоных скарбаў», за якія ён мог трымаць войска і, несумненна, за вялікую пашану і палітычны ўплыў у дзяржаве. Ён браў на сябе цяжар абароны, як свяшчэнны абавязак перад Айчынай. «Калі маім слабым сілам даручана нахіленую Рэчы Паспалітай сцяну падпіраць і неасцярожна ўчынены пажар гасіць трэба, дык гадам і здароўю дзеля Айчыны не дам адпачынку». Хоць нешматлікае войска, дарэчы пераважна нанятае за грошы Сапегі, і не прагнала шведаў з Лівоніі, але ўсё ж не пусціла заваёўнікаў у ВКЛ і вызваліла Курляндыю.

Маючы «незлічоныя скарбы», якія Сапега, як даволі практычны чалавек сабраў за жыццё, карыстаючыся сваім высокім становішчам, ён шмат траціўся на дабрачыннасць. Кіраваўся лацінскім выразам: «Марна жыве той, хто нікому не дапамагае», напісаным на яго экслібрысе. Уражвае колькасць пабудаваных Львом Сапегам хрысціянскіх храмаў, толькі касцёлаў аж 24(!) у Вільні (Святога Міхаіла, дзе ён і пахаваны), Брэсце, Бялынічах, Бярозе, Гародні, Оршы (комплекс езуіцкага кляштара нядаўна адноўлены), Ружанах (Святой Тройцы захаваўся), Сапежыне і іншых, а таксама ўніяцкіх і праваслаўных цэркваў. Пры іх адкрываў школкі, шпіталі і прытулкі. Так што Леў Сапега пакінуў свой след не толькі ў гістарычных падзеях, але і ў помніках дойлідства, і ў сваіх годных справах.

Варта завяршыць жыццяпіс Льва Сапегі словамі аўтара «Гісторыі Літвы» Альберта Віюка Каяловіча, адрасаваныя яго сыну Казіміру Лявону: «Як мне не гаварыць пра твайго бацьку, які заслужыў надзвычайную славу? Рашэннем мудрага караля Стафана, ён, вядома, быў выбраны з такога мноства і прызначаны на пастаянную каралеўскую службу, не параўноўваючы з верным Ахатам. Па смерці караля ён памалу ўздымаўся да вышэйшых дзяржаўных пасад і напрыканцы воляй усёй дзяржавы быў аб'яўлены гетманам ВКЛ пасля вялікага Сцыпіёна Літвы Хадкевіча. Ён, атрымаўшы гэтую спартанскую пасаду, так сябе паводзіў, што можна было паверыць, што ў ім уваскрос Хадкевіч».

Вітаўт ЧАРОПКА.

Сваімі словамі

НЯХАЙ У АГНІ НЕ ГАРЫЦЬ

Увесь свет і беларусы ў тым ліку плачуць аб згарэлым у Парыжы саборы Нотр-Дам. Адразу варта ўдакладніць, што сабор згарэў не цалкам — абрынуўся толькі яго шпіль. Дзве вежы ўдалося патушыць — літаральна за пару хвілін да абрушэння. Усё, парушанае агнём у Нотр-Даме, рана ці позна адновяць, у гэтым няма ніякіх сумневаў. Аднак колькі ўсяго было знішчана (у выніку стыхіі ці наўмысна па нечым загадзе) у нашай краіне. І ці плачам мы аб гэтым так горка?

Літаральна днямі прыйшла навіна аб тым, што ў Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці згарэў драўляны касцёл, пабудаваны ў канцы XIX стагоддзя. Месцічы палілі сухую траву, а ў выніку агонь перакінуўся і на драўлянае збудаванне — ад яго засталася толькі частка абгарэлага каркаса. Пра здарэнне напісалі многія СМІ. Аднак гэта ўсяго навіна аднаго дня — учарашнія навіны, як правіла, ніхто не памятае... У касцёле не праводзіліся службы ўжо 30 гадоў. Наўрад ці нехта возьмецца яго аднаўляць.

У мінулую сераду ў вёсцы Рамні Гарадоцкага раёна згарэў драўляны касцёл Святых апосталаў Пятра і Паўла.

Здараліся і іншыя пажары, якія забіралі ў нябыт выдатныя ўзоры беларускага драўлянага дойлідства. Як прыгадала намеснік начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Наталля Хвір, у 2010 годзе агонь знішчыў драўляную царкву Святога Мікалая Цудатворца ў вёсцы Стары Крыўск Рагачоўскага раёна, пабудаваная яна была ў 1852 годзе. Такі ж трагічны лёс напаткаў і царкву Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Хатляны Уздзенскага раёна. Абодва храмы з'яўляліся помнікамі гісторыка-культурнай спадчыны і ўваходзілі ў ахоўны спіс. Але, як той казаў, агонь распарадзіўся іначай. Тэарэтычна гэтыя аб'екты можна аднавіць, мяркуе Наталля Хвір, бо даследаванні па іх праводзіліся. Аднак практычна на месцы цэркваў — выпаленыя пусткі.

Яшчэ адна «пажарная» гісторыя, але са шчаслівым фіналам, адбылася ў ноч перад Раством у 2002 годзе (можа, святы час нараджэння Ісуса паспрыяў таму, што ўсё скончылася добра?). 24 снежня ў 19.21 у пажарную частку Нясвіжа паступіў выклік. Гарэў палац Радзівілаў! Першая пажарная машына была на месцы ўжо ў 19.30. Вельмі хутка туды пад'ехала яшчэ 18 машын, агулам жа пажар тушылі 92 чалавекі. Брандмайстры ацанілі пажар як не вельмі буйны, але досыць складаны з-за нестандартнай планіроўкі будынка. За дзве з паловай хвіліны агонь быў патушаны. Усю першую палову дня 25 снежня спецыялісты падраздзялення адпампоўвалі ваду з камінай залы замка на плошчы прыкладна 300 квадратных метраў.

Прычыну пажару ў замку знайшлі даволі хутка (ён адбыўся падчас рэстаўрацыі старадаўняга мура). Два слесары праводзілі адагрэў трубы і бака сістэмы ацяплення. Пры гэтым загарэўся ўцяпляльнік — рабочыя залілі яго пяццю вёдрамі вады і сышлі. Аднак праз нейкі час вартаўнік убачыў языкі полымя пажару над дахам палаца і выклікаў ратавальнікаў... Уратавалі!

Можна прыгадваць і іншыя выпадкі, як сумныя да слёз, так і тыя, што выклікаюць захапленне спрытнасцю і прафесіяналізмам тых, хто апярэдзіў бяду, «стаў у праломе». Многія знакавыя аб'екты, такія як Фара Вітаўта ў Гродне і іншыя, былі брутальна ўзарваны рукамі савецкіх службоўцаў. Апошнім часам сталічныя будынкі першай электрастанцыі і Маскоўскага вакзала таксама зніклі з карты горада: былі прынятыя рашэнні аб мэтазгоднасці зносу культурных каштоўнасцяў. Аднак, як сведчыць гісторыя, такія рашэнні ніколі не бываюць правільнымі. На месцы электрастанцыі — так і не завершаная пакуль «гаргэра» ў самым сэрцы горада, якая ну вельмі муляе вока. На месцы Маскоўскага вакзала — пустка — будаваць пакуль перадумалі, хоць па плане ўжо павінен быў стаяць новы гмах «Газпрама»... Зноў памыліліся, ахвяраваўшы сваім дзеля замежнай будоўлі?

На рэстаўрацыю Нотр-Дама ўжо сабралі 1 мільярд еўра. Дзве сям'і бізнесоўцаў вырашылі ахвяраваць па 200 мільёнаў еўра, яшчэ адна — 100 мільёнаў. Астатнія неабыякавыя людзі таксама вельмі хутка ўключыліся ў збор сродкаў на аднаўленне страчанай прыгажосці сабора, хто колькі мог. А ў што ператворацца нашы слёзы аб страчаным? У канкрэтную дапамогу там, дзе яна патрэбна? Ці проста ў загінулыя нервовыя клеткі?.. Апошнія, між іншым, дакладна не ўзнаўляюцца.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении электронных торгов

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by
Продавец	ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

Лот №	Марка, модель, тип кузова или наименование установленного оборудования, рег. знак, год выпуска	Инвентарный номер	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
1	**ЗИЛ-131**, грузовой бортовой, 9348 АЕ-5, 1975	100000013651	4 200,00
2	**ВАЗ-21310**, легковой, 1368 АС-5, 2003	100000013711	2 880,00
3	**УАЗ-3163**, легковой, 3927 АС-5, 2005	100000013713	4 800,00
4	**ГАЗ-2705**, фургон, АВ 7846-5, 2007	100000013678	3 240,00
5	**ГАЗ-33023**, грузопассажирский бортовой, АА 7926-5, 2006	100000013675	3 360,00
6	**УАЗ-3909**, фургон, АН 2908-5, 2004	100000013664	1 440,00
7	**УАЗ-39099**, фургон, АА 5799-5, 2005	100000013668	1 440,00
	Лоты №№ 1–7 находятся по адресу: аг. Староселье, Крупский район, Минская область, филиал «Крупское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»		
8	**ВАЗ-2131**, легковой, 0427 IX-5, 2003	100000016218	1 440,00
9	**ГАЗ-3110**, легковой, 1360 IX-5, 2001	100000016200	1 116,00
10	**УАЗ-23632-232,** пикап, АК 1122-5, 2010	100000016192	6 000,00
	Лоты №№8-10 находятся по адресу: аг. Михановичи, Минский район, филиал «Минское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»		
11	**УАЗ-23632**, пикап, АІ 9381-5, 2010	100000039284	8 880,00
12	**УАЗ-31514**, легковой, 3507 IP-5, 2003 (по ТП не определен), установлен кузов 2012 г. в.	100000038757	7 680,00
	Лоты №№ 11–12 находятся по адресу: г. Несвиж, ул. Сновская, Минская область, филиал «Несвижское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»		
13	**МАЗ-5516**, самосвал, АІ 2001-4, 2001	100000031888	8 880,00
	Лот № 13 находится по адресу: ул. Гродненское шоссе, 6А, г. Слоним, Гродненская область, филиал «Слонимское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»		
14	**ГАЗ 66-11 ВМ2001**, автобус вахтовый, АВ 8742-1, 1991	100000046410	4 440,00
15	**УАЗ-3909**, фургон, АІ 8844-1, 2004	100000046340	1 440,00
	Лоты №№ 14–15 находятся по адресу: ул. Дзержинского, 135, г. Кобрин, Брестская область, филиал «Кобринское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»		
16	**Урал-4320**, экскаватор автомобильный, АЕ 3656-6, 1997	100000020422	25 440,00
	Лот № 16 находится по адресу: аг. Лапичи, Осиповичский район, Могилевская область, филиал «Осиповичское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»		
17	**ГАЗ-2752**, фургон, АВ 2651-3, 2007	100000021889	3 600,00
18	**ГАЗ-32213**, автобус-вагон, АА 3353-3, 2006	100000021947	2 880,00
	Лоты №№ 17–18 находятся по адресу: Урицкий с/с, 1, Гомельский район, Гомельская область, филиал «Гомельское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»		
19	**МАЗ 8926***, прицеп бортовой, 8377 АА-5, 1988 (по ТП не определен) * номер рамы уничтожен, без права снятия с учета в течение 3 лет, заключение УВД Миноблисполкома от 07.10.2013	100000042858	1 680,00
20	**МАЗ 6317**, фургон-мастерская, АО 4742-5, 2000	100000031912	14 160,00
	Лоты №№19-20 находятся по адресу: ул. Либаво-Роменская, 165, г. Молодечно, филиал «Молодечненское УБР ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»		
21	**ГАЗ-2752**, фургон, АВ 7877-7, 2007	100000036568	2 760,00
22	**ГАЗ-33081**, фургон-мастерская, АА 2216-7, 2005	100000036551	8 040,00
	Лоты №№ 29–33 находятся по адресу: ул. Ф. Скорины, 4, г. Минск, Управление «Минскавтогаз»		

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата, время и место проведения электронных торгов: 13.05.2019 в 12.00, каждый следующий лот с интервалом 10 минут, на ЭТП «ИПМ-Торги» **www.ipmtorgi.by** Аккредитованному участнику, подавшему в адрес организатора торгов пакет документов и прошедшему предварительную регистрацию, ЭТП предоставляется время до начала торгов в режиме реального времени, для заключительной регистрации (начало заключительной регистрации за 2 часа до начала электронных торгов). В случае не прохождения регистрации, участник к торгам не допускается. После прохождения регистрации, участник получает доступ в аукционную комнату, где ожидает старта торгов в режиме онлайн

Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация)	**10.05.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Контактные телефоны	+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42; auction@cpo.by

УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 31.05.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Богуновой М. Н.

Легковой седан «Audi A8L», 2008 г. в., начальной стоимостью 18 700 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНП 190431606

Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж» приобретает акции собственного выпуска

Полное наименование, местонахождение покупателя акций	Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а, контактный телефон – 8 0232 35 91 02
Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого покупаются	Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а, контактный телефон – 8 0232 35 91 02
Цель приобретения акций	Для дальнейшей продажи инвестору на условиях, предусмотренных бизнес-планом эмитента, с целью развития акционерного общества
Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель	3500 (три тысячи пятьсот) простых (обыкновенных) акций
Цена приобретения акций	20,00 (двадцать) белорусских рублей 00 копеек
Порядок и форма расчетов	Оплата в белорусских рублях не позднее 60 (шестидесяти) банковских дней с даты заключения договора купли-продажи, путем безналичного расчета
Адрес, по которому будет заключаться договор купли-продажи	246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а, открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», контактный телефон – 8 0232 35 91 02
Дата начала и окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций	Предложение о продаже акций принимаются с 13 мая 2019 г. по 14 июня 2019 г.
Дата начала и окончания заключения договоров купли-продажи акций	с 17 июня 2019 г. по 31 августа 2019 г.

УНП400052115

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
На 31 декабря 2018 года

Организация	ООО «Страховой брокер Автокаско ПЛЮС»
Учетный номер плательщика	806000592
Вид экономической деятельности	Страховое посредничество
Организационно-правовая форма	Общество с ограниченной ответственностью
Орган управления	
Единица измерения	тыс. руб.
Адрес	220002, г. Минск, ул. Володько, 9-24

Дата утверждения	11.03.2019
Дата отправки	
Дата принятия	

Активы	Код строки	На 31 декабря 2018 года	На 31 декабря 2017 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	19	53
Нематериальные активы	120	-	-
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
в том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	-	-
Долгосрочные финансовые вложения	150	-	-
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**19**	**53**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	-	-
в том числе:			
материалы	211	-	-
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	-	-
готовая продукция и товары	214	-	-
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	5	1
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	-	-
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	76	96
Краткосрочные финансовые вложения	260	-	-
Денежные средства и эквиваленты денежных средств	270	75	94
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**156**	**191**
БАЛАНС	**300**	**175**	**244**
Собственный капитал и обязательства	**Код строки**	**На 31 декабря 2018 года**	**На 31 декабря 2017 года**
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	34	34
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	-	-
Добавочный капитал	450	-	-
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	79	88
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**113**	**122**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**-**	**-**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	62	122
в том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	38	81
по авансам полученным	632	-	-
по налогам и сборам	633	10	14
по социальному страхованию и обеспечению	634	4	5
по оплате труда	635	7	8
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	1	11
прочим кредиторам	638	2	3
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**62**	**122**
БАЛАНС	**700**	**175**	**244**

ОТЧЕТ
о прибылях и убытках за январь–декабрь 2018 года

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2018 года	За январь – декабрь 2017 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	843	798
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(130)	(132)
Валовая прибыль	030	713	666
Управленческие расходы	040	(219)	(173)
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	060	494	493
Прочие доходы по текущей деятельности	070	-	1
Прочие расходы по текущей деятельности	080	-	(1)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	494	493
Доходы по инвестиционной деятельности	100	1	1
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	-	-
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	1	1
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(4)	(3)
в том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	-	-
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(4)	(3)
Доходы по финансовой деятельности	120	11	12
в том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	11	12
прочие доходы по финансовой деятельности	122	-	-
Расходы по финансовой деятельности	130	(9)	(6)
в том числе:			
проценты к уплате	131	-	-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(9)	(6)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-	-

Наименование показателей	Код строки	За	За январь -декабрь
1	2	3	4
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	140	(1)	4
Прибыль (убыток) до налогообложения	150	493	497
Налог на прибыль	160	(89)	(89)
Изменение отложенных налоговых активов	170	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	-
Чистая прибыль (убыток)	210	404	408
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	-	-
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток)	240	404	408
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Руководитель _____ (подпись) Т. В. Шимковская (инициалы, фамилия)

Главный бухгалтер _____ (подпись) О. Л. Кричковская (инициалы, фамилия)

11 марта 2019 г.

Директору ООО «Страховой брокер Автокаско ПЛЮС» Шимковской Т. В.

от 17.04.2019

Аудиторское заключение по бухгалтерской отчетности за 2018 г. ООО «Страховой брокер Автокаско ПЛЮС»

Аудируемое лицо: ООО «Страховой брокер Автокаско ПЛЮС».

Местонахождение: 220007, г. Минск, ул. Володько, 9, пом. 24.

Свидетельство о государственной регистрации № 0000041 выдано 27.06.2014 г. на основании решения Министерства финансов Республики Беларусь.

УНП 806000692.

Аудиторская организация: ЗАО «МастерАудит и Консультации».

Местонахождение: 220070, г. Минск, пр-т Партизанский, 45, пом. 2 Н.

Свидетельство о государственной регистрации № 0098542 выдано на основании решения Минского горисполкома от 06.04.2015 г.

УНП 191373133.

Аудиторское мнение

Мы провели аудит годовой бухгалтерской отчетности **ООО «Страховой брокер Автокаско ПЛЮС»**, состоящей из бухгалтерского баланса по состоянию на 31 декабря 2018 г., отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, примечаний к бухгалтерской отчетности, предусмотренных законодательством Республики Беларусь.

По нашему мнению, прилагаемая годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение **ООО «Страховой брокер Автокаско ПЛЮС»** по состоянию на 31 декабря 2018 г., финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

«ЦЕЛА ДАГЛЯДАЕМ, А ДУШУ ІГНАРУЕМ»

Што шукаюць сем'і, якія едуць да айца Валерыяна ў гарадскі пасёлак Смілавічы?

Сёння, здаецца, увесь свет перавярнуўся з ног на галаву. Рэдкія навіны абыходзяцца без паведамлення пра жахлівае забойства або няшчасны выпадак. Сын падымае руку на бацьку, дзяўчынка выскоквае з акна дзявятага паверха, маці выкідвае на сметніцу нованароджанае дзіця. І гэта толькі бачная вяршыня айсберга. Калі хварэе цела, не трэба тлумачыць, куды ісці. А калі чалавек знешне здаровы, але ўнутры яго творыцца нешта незразумелае? Тое, што прымушае яго рабіць усе гэтыя страшныя крокі? Пра такіх заўсёды казалі, быццам бы ў іх «нячысцік усяліўся». І лічылася, што дапамагчы справіцца з ім могуць толькі экзарцысты — тыя, хто выганяюць нячыстага. Карэспандэнт «Звязды» меў магчымасць паназіраць, як з гэтым спраўляецца адзіны дзеючы ў краіне праваслаўны экзарцыст.

Айцец Мікалай дае духоўную параду.

ДУХОЎНАЯ ЛЯЧЭБНІЦА

Айцу Валерыяну са Смілавіч даў на гэта благаславенне яшчэ Мітрапаліт Філарэт. У Смілавічы часта арганізуюцца паломніцкія паездкі, нехта едзе туды сваім ходам. Маўляў, цікава паглядзець, як бацюшка чарцям хвасты накручвае. У сеціве шмат водгукаў з нагоды ўбачанага — ад экзальтавана-захопленых да крытычна-недаверлівых. І гэта таксама падаграванае цікавасць.

